БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. **15 к.**

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру(
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 8. Менск. Нядзеля 31 сакавіка 1918 г. Год I

Менск 31/III.

Ніхай вас квартальны рассудзіць.

Гэта кароткі сэнс стацці у «Voss Z.» вядомаго нямецкаго публіцыста Бернгардта, калі ён разгледзіў досіць акуратна дамагання літвіноў, палякоў, беларусаў, украінцаў, латышоў, эстонцаў, балтыцкіх немцаў. Нам усе гэтыя нацыянальныя справы больш—меньш знаёмы. Бэрнгард глядзіць на іх с пункту выкарыстания іх дзеля гэрманскіх інтарэсаў.

Як выпоўніць усе трэбавання народаў, каторыя яны падводзяць пад «самаадзначэнне нацый»? кожная нацыя разумеіць гэты тэрмін па свой фасон.

Курляндзкая справа самая простая, курляндзкія немцы «самаадзначыліся» пад Гэрманію, брэсцкі дагавор пазволіў гэта зрабіць. Але у Курляндзіі памешчыкі і мешчане немцы, а селяне—латышы. Згадзіць іх інтарэсы ні лёгка. Але балты-немцы трэбуюць прылучыць да іх яшчэ Ліфляндзію з Рыгай і Эстляндзію з Рэвелем Тут ужо, як кажуць, забіты цьвек!

Па міравому дагавору яны павінны «самаадзначыцца» пры Расіі. Курляндзія і малая Літва патрэбны для Гэрманіі, каб выраўняць граніцу. Ліфляндзію і Эстляндзію прыбаўляць да Гэрманіі—гэта значыць браніца яшчэ за новую хітрую гісторыю.

Прыбаўка да Гэрманіі Ковэнскай і Сувалкскай літвы выпрамляець граніцу. Але літвіны хацелі бы злучыцца з Гэрманіей, за нейкі час зрабіўшыя гэрцогствам с каталіцкім князем. Добра усё, кажыць Бэрнгардт, але праз нейкі час Літва скажыць: «адье», тагды яна «адрэжыць немцаў ад Курляндзіі. Гэтым з Літвой яшчэ ні канец. За Вільню спораць палякі і літвіны.

Гэты спор ніколі нязаспакоіцца. Беларусы так само дамагаюцца Вільні і цэлай тэрыторыі ад Белостоку да Смаленску і ад Дзьвінску аж за Прыпяць.

Чародны № газэты «Беларускі Шлях» с прычыны Вялікадня выйдзе у сераду 3-го красавіка.

[Карту гэтай Беларусі Бэрнгардт надрукаваў у газэці].

«Вельмі праўдзівыя дамагання беларусаў», кажэць нямецкі публіціст, «ні могуць быць залагожэны Гэрманіей, бо тут ідзець аб расейскую обласьць. Але усё роўна будзе Вільня польская ці літоўская, у Расеі зробіцца беларуская іррэдэнда, каторая будзе цягнуць рукі да Вільні, Менску, Гродні, Беластоку, (Бэрнгардт абмылкова акрысьціў іх польскімі гарадамі) і «украінскім» Брэсту і Пінску».

«Калі гэтыя нацыі памеж сабой сварацца па за сфэрай нямецкіх інтэрэсаў, гэта ні беда».

«Гэрманія можа узяць на сябе разбор дамаганнеў гэтых нацый, але тут ёсьць нібязпэка дастаць замест поўпрыяцеля цэлаго ворага, а то і двох. Ці ні лепш нам, урэгуліроваўшы сваю ваенную граніцу, аддаць усё на заход ад Коўны, на палудзень ад лініі Гродна—Асавец палякам ці расейцам, а то нямецкі дзяржаўны карабель можэ сесьці на мелізну у акеане нацыянальных ідэалаў».

* * *

Мы у вольнай перадачы прэдставілі думкі вядомаго гэрманского публіцыста, аб землях быўшаго Вялікаго Княжэства Літоўскаго. Нацыянальные дыплёматы і палітыкі усіх нацый павінны кіравацца брацскай згодай усіх сумежных народаў, каторые павінны памеж сабой самі перш згаварыцца, бо ад грызні ня будзе карысьці, самім нацыям, нехта трэцці выкарыстае сваркі для сваіх інтэрэсаў.

„Тая" Беларусь.

Установленая у Бярэсьцю граніца адрэзала ад Расіі Курляндзію, Рыгу з ваколіцамі этнографічную Літву і, як піша «Dz. Wileniki», больш каталіцкія часьці Беларусі.

Новая тэрыторыя займае: 1] даўнейшую Курляндзкую губэрнію с местам Рыгаю; 2] даўнейшую Ковенскую губэрнію (бэз усходняй часьці, Азерскаго павету] 3) заходнюю палавіну даўнийшай Віленскай губ. с паветамі Віленскім, Троцкім і Лідскім і заходняй часьцію Сьвенцянскаго; 4] Гродзенскі, Беластоцкі, Бельскі, Сакольскі, Волковыйскі і поўночную часьць Пружаньскаго—з Белавежскай пушчай—паветы Гродзенскай быўшай губ.; Кобрынскі, Бярэсцкі і поўднeвая часьць Пружаньскаго пав. Гродзенскай губ. прылучэны да Украіны,

Павэдлуг высноўкаў праф. Е. Ѳ. Карскаго апублікованых ім у брашуры дажанай да этнографічнай мапы беларускаго племяні, («Этнографическая карта белорусскаго племени» Составил Е. Ѳ. Карскій. Петроград 1917 г. Тіпогр. Рос. Акад. Наук.], на выжэй азначанай тэрыторыі жывець беларусаў:

ГУБЕРНІІ.	Лічба беларусаў пар рэвізіі 1897 г.	Прырост насялення па губэрніям.	Лічба беларусаў па рэвізіі 1897 г., с прыростам да 1917 г. па складн. °/о	Круглая лічба паводлуг устаноўленай пр. Карскім для 1917 г.
Курляндская . .	12.283	0,83°/о	14.491	23.500
Ковенская . . .	37.798	1,31°/о	41.732	60.000
Віленская (Віленскі, Троцкі, Лідскі і 1/2 Сьвенцянскаго - зблізжаючы—паветы] .	327.369	1,64°/о	(упростых°/о) 434.746	(тая же лічба). 434.746
Гродзенская [выключаюча Слонімскі павет].	522.391	1,63°/о	(у простых°/о) 692,700	(тая же лічба) 692.700
УСЯГО	899.841	—	1.183.669	1.210.946

Лічбы для Віленскай і Гродзенскай губ. зроблены намі асобна толькі для адрэзаных ад Расіі паветаў, с тым, што для Сьвенцянскаго павету, узята палавіна усяго насялення (81.845:2). Выходзіць агульная лічба,—1.210.946, з данных усерасіiскай агульнай рэвізіі 1897 г. У часе гэтай рэвізіі, кажэ пр. Карскі,—«па шмат якіх мейсцох беларусы-праваслаўныя ні адрожнівaючы народнасьць ад рэлігіі называлі сябе проста «рускімі» і рэгістратары іх упісывалі як вялікарусаў, а у некаторых мейсцах і як украінцаў, калі рэгістратар кепска адрожніваў беларусаў ад украінцаў; у іншых мейсцах беларусы каталікі с тае-ж прычыны называлі сябе «палякамі» і прыпісываліся да палякаў».

Дзеля таго правідловая лічба павінна быць значна большай.

Тые часьці, каторыя маніцца узять сабе Украіна пры устаноўленню граніцу з Расіяй, пад увагу ні ўзяты.

А.—І.

С Кіева.

На Украіне пасьпешно напраўляецца папсаваная «большэвікамі» комунікацыя. Почта тэлеграф ужо працуюць паміж Кіевам—Канатопам, Кіевам—Жытоміpам, Кіевам—Белай Царквой, Жмерынкай і Бердічэвам. На гэтых днях ўстановіцца жалезна-дарожная комунікацыя без перэсадкі з Варшавай, Вільняй, Бэрлінам і Венаю.

Гэтымі днямі у Кіеў прыбыло з Гэрманіі шмат гайдамацкіх аддзелаў, арганізаваных немцамі і ваена-палонных. Гайдамакі добра адзеты, выглядаюць здаровымі, бодрымі. Другога войска на Украіне амаль што німа. Дабравольная армія творыцца надта ціха. Ні гледзючы на высокую пэнсію (300 рб. у мес. салдату) і вялікую лічбу бэзработных, ахвотчікаў знайходзіцца ні шмат. У Гайдамакаў дысцыпліна руская. Добравольцы абучаюцца па сярэдня-эўропэйску.

Заняты ачысткай Украіны ад бальшэвікоў толькі нямецкія войскі. Украінцы покульшто толькі забаўляюць Кіяў парадамі і цэрэмоніялaмі. Немцамі-ж падрымліваецца парадак і у сярэдзіне краю.

Украінскі урад, перемагаючы супраціўніцтво органаў месцоваго самапраўлення, вядзець ніухільную украінізацыю. Усе неукраінцы павінны па яго загаду выехаць з Украіны. Першым чынам церпяць ад гэтаго служачые усякіх установау—ніукраінцы.

У пачатку сакавіка у Кіеве злажыўся «Беларускі вайсковы камітэт на тэрыторыі Украіны». Камітэт складаецца с 4 камісіяў палітычнай, культурна-прасьветнай, грашавой і ваеннай.

У камітэте працуюць два відных прафессара унів. св. Уладзіміра, студэнты і члены разагнанаго большэвікамі беларускаго з'езду Поуз.-зах. фронту. Камітэт уладжвае лекцыі, сходы, выдае дапамогі беларусам. Робяцца заходы каб

выдаваць беларускую газэту, паадкрываць кніжныя склады і інш. У сярэдзіне Сакавіка Камітэт зложыу Украінскаму ураду мэморыю у якой заяўлен протэст проціў гвалтоўнага прылучэння да Украіны беларускай тэррыторыі у Чарнігаўскай, Менскай і Гродзенскай губ. Пратэст падтрымоўваўся соц.-рэв. і прэдстаўнікамі адабраных беларускіх абшараў.

Свой.

Імпэратор Германіі і Малая Літва.

Літоуская дэлегацыя выслала з прычыны прызнаня незалежнасці Літвы такую тэлеграму:

Яго Вялічэству Імпэратору. Вашэ Вялічаства дазвольце Вас найма цней падзякаваць Прэзыдэнту і дэлегацыі літоўскай Тарыбы (Рады), каторай сягодня імпэрскі канцлер завядаміў аб прызнанні незалежнасці Літвы. Моцная і Вялікая Гэрманія дала свабоду, цэлые вякі заціснутаму, літоўскаму народу і прызнала яго незалежнасць.

Мы рады гэтаму разумеючы што Гэрманія і Літва, як два добрые суседа будуць узаемнай мірнай працай памагаць адбудаванню.

Сметона, Прэзыдэнт Шаўіе, Стаугайтіс, Вілейшыс, дэлегаты. Імпэратор адказаў так:

Пану прэзідэнту Сметона! На тэлеграму с прычыны прызнаня незалежнаго Літоўскаго гасударства, я дзякую Вас, пан прэзыдэнт і членаў літоўскай дэлегацыі. Я рад што пабеда маіх войск асвабадзіла Літоўцаў ад расейскаго ярма і дала мне змогу Літву як незалежную і свабодную адбудаваць. Прыціск яе нацыянальнаго жыцця праз доўгія чорныя годы з гэтым кончыўся.

Я спадзеваюся, што Літва як дзяржава скора закрасуець і яе звязак цесны з Гэрманіей яе разьвіцце падтрымаець.

Вільгэльм І. Р.

Па сьвеце.

(З нямецкіх апошніх газэтаў).

У Расіі.

Троцкі у таварыстве афіцэраў ангельскаго і амэрыканскаго штабаў атправіўся у Сыбір для інспэкцыі.

Адмірал Вэрдэрэўскі узяу на сябе опэрацыйнае і тахнічнае кіраўніцтво Балтыйскім флотам.

Паміж Савецкім Урадам і донскімі казакамі паводлуг паведамлення з Масквы, началіся перагаворы аб згодзе, якія здаецца пойдуць добра.

Коаліцыйны дыплёматычны корпус вярнууся у Расію с Фінляндзіі. З загаду камісара унутрэных спраў Іоффэ, корпусу быў пададзены спэцыяльны цягнік.

Началася эвакуацыя Сэвастопаля, каторую утрудняюць анархічна настроеныя салдаты і матросы.

Амэрыканскі консул у Владзівостоку адкупіў увесь гандлёвы флот які знайходзіўся на усходніх берагох Сыбіры, усяго на 650000 к.

Ваенны камісар Троцкі зьвярнуўся да Францыі с просьбаю аб ваеннай помачы, і у поважненню франц. ваен. міссіі, у якой знайходзіцца каля 500 францускіх афіцэраў. На супольным пасядзенні главнай камісіі Парляманту і францускаго сэнату Пішон асьведчыў, што францускі урад дасьць сваю згоду.

Троцкі зьвярнуўся да народу с адозваю у якой паведамляе, што у скорасьці мае выйсьці дэкрэт аб агульнай для усіх грамадзян павіннасьці адбываць ваенную навуку. Усе быўшые гэнэралі і афіцэры будуць варочаны на службу як інструктары пад кірункам народных камісараў. Троцкі абецае выставіць мільённую армію.

Шесьць вялікіх князёў жыўшых у Пецярбургу пераводзяцца у Перм.

Ацэніваючі ангельскія ваенныя ніудачы газэты пацешаюцца тым што немцам удалося заняць толькі тэррыторыю але ні разьбіць ангельскую армію і разадраць фронт, што, відаць было заданнем нямецкіх ваенных сілаў.

Кароль асобнай тэлеграмай выказаў падзяку генералу Сальманду, ахвіцэрам і салдатам паветранаго флоту за іх чыннасьць у часе апошняго нямецкаго наступлення.

У Францыі.

Клемансо зрабіў у Парыжу 27/III паведамленне Радзе Міністраў аб ваенным становішчу, Інформуючы аб становішчу фронта, адкуль ён толькі што вярнуўся, Клемансо высказаў здаволенне фронтам.

Рэзэрвы коаліцыі з вялікім пасьпехам на аўтомабілях сцягваюцца на найболей пагражаные пункты фронту. Вялікая францускае армія пад кіраўніцтвам асобнаго генэрала сьцеражэ дарогу у Парыж адкуль ішчэ уцекаюць жыхары. Жыхары Дюнкірка, і прыфронтавых районаў Каля і Нэрна Армйнт'ера і Ля Басэ пакідаюць свае мейсцы забіраючы с сабой усе сваё менне.

Амьен і Компьен эвакуіруюцца ад цывільнаго насялення. Паводлуг зданія ваеных аўторытэтаў Амьен з'яўляецца апорным пунктам і ключом усяго ангельскаго фронту у Францыі, каторы ангельцы павінны на усе старацца утрымаць, калі ніхочуць адчыніць немцам вароты да мора.

У Англіі.

Нямецкая ваенная удача у Францыі зрабіла у Англіі уражэнне. Наперакор звычаю газэты выйдуць у Вялікую пятніцу, а ваусіх пачтовых канторах праз сьвяты будуць вывешывацца паведамленні.

Паднялося пытанне аб скліканню парляманту, проціў чаго вымоўляюцца нікаторыя газэты, лічучы, што гэта не прынесла-б цяпер карысьці.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Пропускі у Польшчу, Прыбальтыцкі Край і Літву будуць выдавацца афіцэрам, дактаром і чыноунікам. Запісь ужо пачалася у афіцэрскім бюро на Петрапаулаускай вул. № 50. У гэтые ж мейсцы з 23 дазволяно браць пропускі і салдатам с канцэлярыі вайсковаго начальніка.

Дэтальная выпіска кватэрантау, як вядома, будзе зроблена на варотах кожнаго дому. Поруч з гэтым цывільны аддзел месцовай управы, дзеля выгоды кватэрантау, стараецца завесьці кватэрныя угадовыя камэры.

Бежэнцоу, каторыя жывуць блізка ракі,—як на Людамонці, Мала-Татарскай, Слабодцы, Плебанскім пер., Архірэйскай Слабодцы і на Ляхауцы,—па распараджэнні месцовой управы—да часу—покуль пройдзе паводка—размешчаюць у «общчэжыціях» камітэту абэзпекі.

У акружным судзе замест даунешых шасьці, цяпер будуць толькі тры аддзэлы: 1) рэгістраціонна - адміністраціуны, 2) адзін цывільны і 3) адзін угалоуны. Служачых у усе гэтые аддзелы разам с канцэлярыяй прэдседацеля прынято усяго 40 чалавек, замест даунейшых—перад эвакуацыяй—200. Выданные тымчасам месцовой управай на абстаноуку 3000 р. ужо разышліся. Суд спадзяецца выціснуць абецаныя местам ішчэ 15.000 р. Аб пэнсіі—пакуль што ніхто не адзываецца.

У суд пачалі ужо паступаць справы і цывільныя, і угалоуныя. Першая сэсія суду адбудзецца у пачатку мая.

С І-га Красавіка бяз службы астаецца па распараджэнню нямецкаго начальства: са скарбовай палаты - 66 вольнанаемных служачых канцэлярыстау і с казначэйства—16.

Служачым, каторые застаюцца пры мейсцах маніліся выплаціць пэнсіі на Вялікдзень усяго 5%, але дэлегацыя служачых, якая хадзіла да немцау, выгаварыла 50% даунейшаго царскаго акладу. Сюды, разумееца, не улічаюцца кватэрныя і харчовыя.

Праца покуль што у скарбовай палаце ні надта цяжкая: здмухіваюць стары пыл і падшываюць старые сшыткі.

На рынку у Вялікую пятніцу было саусім пуста. Цэны на усе—шаленыя: яйкі дзесятак—5 р. 50 к., шынкі цэлыя—4—5 руб. за фунт, возік дрэнных дроу—35рубл. і г. і.

Справа бежэнцоу. Гэтымі днямі прыеджае з Вільні у Менск камісія дзеля перагаворау з нямецкім начальствам, каб наладзіць справу пераезду бежэнцоу на свае старыя мейсцы. Цяпер гэта як раз на часе, бо усе тутэйшые бежэнскіе камітэты весьці сваей працы далей ня могуць і нат перэсталі выдаваць пайкі, людзі засталіся бяз усякай падмогі і апекі.

Агульны сход членау рускаго клюбу с пазвалення камэндатуры замест 30 сакавіка—назначаны на 5-ае красавіка. Найважнейшая справа, якой усе члены зацікаулены, гэта кража 8000 р. клюбных грошау у быушаго распарадзіцеля—старшыні—п. Гагарына, п. Гагарын—б. член «саюзу рускаго народу», заведуючы аддзелам магазыннай службы упраулення Л. Р. ж. д,

Губэрнскае прысутство, разгнанае бальшэвікамі, прыдзецца цяпер, бадай, зноу зьбіраць і наладжываць. Даўней у губэрнскае прысутство паступалі жальбы на пастановы павятовых міравых з'ездау; якую работу цяпер ям даручаць—хутка выясьніцца.

Рымска-каталіцкая духоуна сэмінарыя быушая у Менску да 1869 р.—цяпер, калі прыеджая сюды біскуп, як есьць чуткі зноу адчыніцца. Справа гэта, разумеецца, шмат будзе залежыць ад Ватыкану.

На палевыя сялянскія работы слічуць немцы у сваіх абвестках, расклеяных па нашым месьце, мужчын, жанок, дзеучат і дзяцюкоу на выязд у Гэрманію. Праезд будзе дармовы; аб харчох і цане за работу трэба угаварывацца тут—на мейсцы. Запісывацца на работы трэба у духоуным вучылішчы.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

АБВЕСТКІ.

Друкарня Я. А. Грыбляга.